**Паўлава С.А.,** *дацэнт*

# АСАБЛІВАСЦІ МІЖЧЫТАЦКІХ СТАСУНКАЎ ЮНАКОЎ З ДАРОСЛЫМІ

Як вядома, развіццё, фарміраванне, выхаванне асобы здзяйсняюцца ў складанай сістэме ўзаемасувязей з грамадствам. Вялікі ўплыў на юнацтва аказвае грамадства дарослых.

Каб выявіць асноўныя характарыстыкі міжчытацкіх зносін юнацтва з дарослымі, мы сабралі наступную інфармацыю:

а) даныя аб арыентацыі юнацтва на дарослых як на аўтарытэт у чытанні;

б) асноўныя характарыстыкі між-чытацкіх зносін юнацтва з настаўнікамі, бібліятэкарамі, бацькамі.

Значная большасць вучняў (70%) карыстаюцца парадамі дарослых пры выбары кніг для чытання. Самымі папулярнымі інфарматарамі ў асяроддзі юнацтва аказаліся бацькі. Бібліятэкары, на жаль, аказаліся тут на апошнім месцы.

Папулярнасць школьных настаўнікаў як інфарматараў аб творах друку таксама невялікая. Асноўная прычына, па нашаму меркаванню, у тым, што міжчытацкія зносіны вельмі рэдка выходзяць за межы нарматыўнага, абавязковага.

Юнакі і дзяўчаты адчуваюць патрэбнасць у міжчытацкіх зносінах з дарослымі. Да зносін з дарослымі яны прад'яўляюць наступныя патрабаванні: жыццёвы вопыт, добры чытацкі густ, уменне цікава расказаць аб рэкамендуемай кнізе або артыкуле, быць у курсе інтарэсаў юнакоў і дзяўчат. Характар міжчытацкіх зносін залежыць ад таго, з кім з дарослых ажыццяўляецца кантакт. Так, зносіны з настаўнікамі і бібліятэкарамі носяць пераважна інфармацыйны і рэгулятыўны характар. З бацькамі юнацтва часцей за ўсё імкнецца наладзіць эмацыянальнае чытацкае ўзаемадзеянне.

Меркаваная ўзаемасувязь міжчытацкіх зносін з дарослымі значна парушана з-за няўмення дарослых наладжваць чытацкія кантакты з юнакамі і дзяўчатамі, а таксама аказваць педагагічны ўплыў на чытанне ў іх асяроддзі.

Намаганні дарослых, накіраваныя на развіццё чытацкіх якасцей юнацтва, у значнай ступені аказваюцца неэфектыўнымі з-за слабага ўзаемадзеяння настаўнікаў, бібліятэкараў, бацькоў, з-за адсутнасці каардынацыі ў планаванні работы школы і бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ